Источник: **«Звязда»** - 2012-06-09

# Аляксандр Лукашэнка і Жарэс Алфёраў абмеркавалі перспектывы развіцця супрацоўніцтва навуковых колаў Беларусі і Расіі

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8 чэрвеня сустрэўся з віцэ-прэзідэнтам Расійскай акадэміі навук акадэмікам Жарэсам Алфёравым.**

У цэнтры ўвагі на сустрэчы, якая праходзіла ў цёплай і дружалюбнай атмасферы, знаходзіўся шырокі спектр пытанняў, у тым ліку перспектывы развіцця супрацоўніцтва навуковых колаў Беларусі і Расіі.



"Найперш хачу падзякаваць вам за вашу жыццёвую пазіцыю. Шчыра прызнаюся, пільна за вамі сачу, за вашымі выступленнямі, заявамі... Беларусь — гэта ваша краіна, ваша радзіма, і я вельмі вам удзячны за вашу пазіцыю. Нават дзесьці мы, можа, крыху не так сябе паводзілі, але вы кідаецеся ў бой за Беларусь. Гэта лейтматыў вашай жыццёвай пазіцыі. І я вам удзячны за гэта", — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Жарэса Алфёрава.

"Гэта цалкам зразумела, інакш і быць не можа", — сказаў вучоны.

Жарэс Алфёраў даў высокую ацэнку развіццю Беларусі, падкрэсліўшы, што гэта сучасная цывілізаваная еўрапейская краіна: "Дарогі, вёскі, гарадкі — усё цудоўнае. Сціпла, таму што не на ўсё ёсць сродкі, але акуратна, чыста, дагледжана, і ўсё працуе".

Вучоны з'яўляецца сустаршынёй навукова-кансультатыўнага савета фонду "Сколкава". "Мы запланавалі ў гэтым годзе выязныя пасяджэнні нашага савета. У сакавіку яно прайшло ў Берліне, у другой палавіне мая — у Акадэмгарадку ў Новасібірску, 20-21 верасня пройдзе ў Мінску", — сказаў ён.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Аляксандр Лукашэнка і Жарэс Алфёраў абмеркавалі перспектывы развіцця супрацоўніцтва навуковых колаў Беларусі і Расіі

Аляксандр Лукашэнка паабяцаў аказаць садзейнічанне ў правядзенні ў Мінску пасяджэння навукова-кансультатыўнага савета фонду "Сколкава". Вырашана, што яно пройдзе ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі.

Акрамя таго, на сустрэчы абмяркоўваліся праблемы развіцця высокіх тэхналогій і навукі ў акадэмічных інстытутах і ВНУ Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**